Выйшаў чарговы нумар часопіса «Веснік сувязі»

Змены ў Правілах функцыянавання нацыянальнай сістэмы кібербяспекі: чаму гэта тычыцца кожнай арганізацыі ў Беларусі і ў чым іх сутнасць, расказвае прадстаўнік Нацыянальнага цэнтра кібербяспекі.

Аб стварэнні «адзінай інфармацыйнай медыцынскай прасторы» - Цэнтралізаванай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя. Як ствараласа ЦІСАЗ, яе магчымасці для доктараў, пацыентаў, органаў кіравання - у інтэрв'ю намесніка дырэктара па тэхналагічным развіцці ААТ «Агенцтва лічбавай трансфармацыі» Аліны Гелашвілі. Адной з першых да ЦІСАЗ падключылася Мінская абласная клінічная бальніца. Як гэта было і што адбываецца зараз, падзяліліся супрацоўнікі медустановы.

Для чаго Цэнтр банкаўскіх тэхналогій распрацаваў Платформу ШІ – расказвае вядучы сістэмны архітэктар Цэнтра Яраслаў Канстанцінаў.

Мытныя органы сёння ў лідарах па ўзроўню лічбавага развіцця. Аб фармаванні «возера мытных даных», пераходзе ад электроннай мытні да інтэлектуальнай і аб лічбавай трансфармацыі, якую праходзіць сёння галіна, расказаў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Дзмітрый Радзівонік.

У рубрыцы «Даты» - матэрыял пра БелДІЭ - ключавы орган дзяржнагляду за электрасувяззю, якому споўнілася 30 гадоў. Тут жа – пра маштабныя сацыяльныя і культурныя праекты МТС і таймлайн тэхналагічных вех кампаніі.

Усё гэта і шматлікае іншае - у друкаванай версіі галіновага часопіса. Падпісвайцеся і чытайце «Веснік сувязі»!

Падпіска на часопіс «Веснік сувязі» заканчваецца 28 ліпеня – не спазніцеся!

За рамкамі друкаванай версіі «Веснік сувязі» расказвае пра сувязь і «лічбу» – у тэлеграм-канале.

Source URL: *https://mpt.gov.by/vyyshau-chargovy-numar-chasopisa-vesnik-suvyazi-0*